Зок-1
10534
ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. №
Б 962

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЗАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 31 (175) | 1—10 лістапада | 1934 г.

ЗМЕСТ

СІНАПТЫЧНЫ АГЛЯД

за дэкаду з 1 па 10/XI-34 г. г.

Барычная сістэма і паветраныя масы ў гэту дэкаду мелі наступны выгляд: цыкланічная дзейнасць (уплывы зніжанага ціску) адбывалася галоўным чынам у Заходняй Еўропе і рухалася праз Прыбалтыку, паўночную частку Совецкага Саюза на Паўночны Урал.

Прахаджэннем цыклонаў і тлумачыцца выпадзенне частых ападкаў у вышэйпамянёнай тэрыторыі, прычым на поўначы Еўропы часта назіралася выпадзенне снегу.

На тэрыторыі Совецкага саюза трымалася пераважна вобласць высокага ціску ў масах кантынентальна-палярнага паветра—сухога і з досыць нізкай тэмпературай, якая дасягала на паўднёвым усходзе Еўрапейскай тэрыторыі Саюза да—10—11°.

На працягу ўсей дэкады тэрыторыя БССР знаходзілася прыкладна на граніцы гэтых двух уздзеянняў г. зн. нізкага і высокага ціску і характарызавалася пахмурным небам і не-

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі нагляд. мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	8	7	2	1	2	6	7	4	4	5	—	5	—	11	—1	4
	3	Полацк	10	8	2	1	2	6	6	3	3	5	—	5	1	12	—1	4
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	10	8	2	0	1	4	5	2	1	4	—	4	0	12	—2	4
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	9	10	1	1	2	6	5	3	3	5	—	4	—	12	—1	3
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	9	8	2	1	2	6	5	2	3	6	—	4	1	12	—1	3
	16	Менск	9	8	3	1	1	7	4	3	3	5	—	4	2	12	—2	5
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	9	8	2	1	1	7	4	2	3	6	—	4	2	13	—2	5
	25	Асіпавічы	9	8	1	1	1	7	3	2	3	6	—	4	2	12	—2	5
	10	Орша	10	7	2	1	2	5	3	2	1	4	—	4	1	12	—2	4
	19	Горкі	10	8	2	0	1	4	2	2	1	3	—	3	1	12	—2	4
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	8	8	2	1	1	8	4	3	5	6	—	5	—	12	—2	5
	30	Мар.-Сосны	10	9	2	2	2	8	4	3	5	7	—	5	2	14	—3	5
	21	Магілеў	10	7	2	1	1	5	3	2	1	3	—	4	1	13	—3	5
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	10	9	3	1	2	4	2	1	1	2	—	4	1	13	—2	4
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2	—	—	—
	32	Жлобін	10	7	3	1	2	6	3	0	2	4	—	4	2	14	_1	8
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	10	9	2	2	2	9	4	4	5	7	—	6	2	14	—3	5
	37	Калінкавічы	10	8	3	2	2	7	3	1	3	5	—	4	2	14	—2	5
	39	Лельчыцы	10	10	2	2	3	8	4	4	5	7	—	5	—	13	—	—
	85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2	—	—	—
	35	Васілевічы	10	8	3	2	2	6	3	0	3	4	—	4	2	14	—2	8
	40	Людвінава	11	8	3	1	2	5	3	0	2	3	—	3	2	15	—3	4

назіранняў з 1—10 лістапада 1934 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны числы)
	Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сума	
85	—	—2	5	4.0	7.0	0.1	..	0.3	0.2	..	7.0	0.2	0.6	—	19.4	туман (2, 4)
87	—	—	—	1.0	5.0	2.0	..	0.5	1.0	0.5	1.0	0.4	..	—	11.4	туман (9)
—	—	—	—	..	4.0	..	..	0.2	2.0	..	0.5	..	..	—	6.7	—
89	12	—5	4	..	2.0	2.0	0.3	0.3	0 5	..	..	..	..	—	5.1	туман (9, 10)
86	—	—1	3	..	6.0	2.0	..	0.1	0.3	..	1.0	0.6	0.1	—	10.1	туман (2, 9)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	—	0	3	..	8.0	1.0	..	..	0.1	..	1.0	1.0	0.3	—	11.4	туман (8, 9)
86	11	—2	5	..	4.0	0.1	0.1	1.0	0.3	..	3.0	2.0	0.2	—	10.7	туман (8, 9)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	16	—2	5	..	6.0	0.5	..	0.3	..	..	1.0	0.4	0 2	—	8.4	туман (10)
86	—	—1	3	..	7.0	2.0	0.1	1.0	..	..	1.0	0.4	0.5	—	12.0	туман (8, 9)
83	12	1	4	..	1.0	..	1.0	..	1.0	..	..	0 2	0.2	—	3.4	туман (9, 10)
84	12	—4	4	..	8.0	..	1.0	0.5	0.3	1.0	0.1	0.1	0.2	—	10.3	туман (4, 10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
85	—	0	5	..	5.0	2.0	..	0.2	..	..	1.0	0.2	0.1	—	8.5	туман (1, 2)
90	—	—	—	..	3.0	..	..	0.1	1.0	..	1.0	0.3	0.1	—	5.5	туман (6, 10)
82	—	—	—	..	7.0	0.5	2.0	1.0	0.4	..	0.4	0.3	0.4	—	12.0	туман (2, 4)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
80	—	—	—	..	7.0	0.4	1.0	1.0	..	..	..	0.5	0.6	—	10.5	туман (10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	—	—	—	..	5.0	3.0	1.0	0.3	1.0	..	..	0.1	0.1	—	10.5	туман (2, 8)
84	—	—	—	..	3.0	..	0.1	0.1	..	..	0.1	..	0.1	—	3.4	туман (10)
80	—	—	—	..	..	0.1	..	0.6	..	..	0.1	0.1	0.1	—	1.0	туман (8, 10)
76	—	—	—	..	..	..	1.0	3.0	..	..	2.0	..	..	—	6.0	туман (1)
—	—	—	—	..	5.0	..	1.0	1.0	..	0.1	..	2.0	0.1	—	9.2	туман (2, 10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
80	—	—3	5	..	8.0	..	0.4	0.6	..	..	..	..	0.1	—	9.1	туман (10)
75	—	—	—	0.1	5.0	..	..	..	..	..	..	0.5	0.1	—	5.7	туман (2, 10)

Габліца вынікаў метэаралаг. назіранняў з 1—10 лістапада 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы — Напрамак	Вецер: Пераважаючы — Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю — Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю — Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме — Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме — Ніжняя	Сярэдні стан паверхоўнага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	SE	6	SE	10	—	9	8	вільготная
	3	Полацк	SE	4	SE	7	—	8	8	»
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	S	6	SE	12	3	9	9	мокрая
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	S	4	S	12	—	8	8	вільготная
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SW	4	S	10	—	9	9	вільготная
	16	Менск	S	4	S	9	—	10	8	сухая
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	S	6	S	10	—	8	8	вільготная
	25	Асіпавічы	SE	4	SE	7	—	8	8	»
	10	Орша	S	4	S	10	—	9	8	сухая
	19	Горкі	SE	4	SE	9	12	10	8	вільготная
III. Цэнтральны (раўнінны)	148	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	SE	4	SE	9	—	8	8	вільготная
	30	Мар'іна-Сосны	S	6	S	10	—	8	8	»
	21	Магілеў	S	4	S	10	—	9	8	мокрая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	S	4	S	9	—	9	8	вільготная
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	—	—	—	—	—	—	—	—
	32	Жлобін	SE	6	S	10	—	9	8	вільготная
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	SE	4	SE	7	—	9	8	вільготная
	37	Калінкавічы	SE	4	SE	7	—	8	8	»
	39	Лельчыцы	SE	4	SE	—	—	8	8	сухая
	85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	—	—	—	—	—	—	—	—
	35	Васілевічы	SE	4	SW	10	7	9	6	вільготная
	40	Людвінава	S	9	SE	10	—	10	10	»

вялікімі імжыстымі дажджамі. Дзякуючы такому распалажэнню БССР, масы яе займаючага паветра амаль што не сустракаліся ў чыстым выглядзе, а большай часткай у выглядзе ранейшага марскога палярнага паветра або кантынентальна-палярнага. Наогул кажучы, надвор'е на тэрыторыі БССР у гэту дэкаду было досыць цёплае без рэзкіх ваганняў тэмпературы, якая ноччу была каля +2 +3°, а ўдзень +4 +5°, і толькі ў некаторыя дні месцамі была заўважана адмоўная тэмпература дасягаючая —1—2°.

У апошнія два дні дэкады назіраліся моцныя туманы.

Харлап

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 1—10 лістапада 1934 г.

Тэмпература паветра на працягу гэтай дэкады вагалася вельмі значна. У першы дзень сярэдняя сутачная т-ра была раўна +8,11 град., а 4-га толькі 0—2°, к 6-му т-ра зноў некалькі павысілася, пераважна на захадзе БССР. Наогул трэба сказаць, што на захадзе БССР было значна цяплей—асабліва ў канцы дэкады. Сярэдняя дэкадная т-ра вагалася ад +да+ + 5°, прычым была на 2—4° вышэй нармальнай.

Максімальная т-ра дасягала +11—15°, мінімальная — 1—3° (пераважна 5-га).

Ападкі ў большасці выпалі ў невялікіх колькасцях, (за дэкаду каля 10 мм.) Большая колькасць ападкаў выпала ў паўночна-заходняй частцы БССР (Дрысса 19 мм). І ў цэнтральнай (Магілёў, Асіпавічы—на 12 мм.) Менш 10 мм выпала ў паўночна-Усходняй частцы (Гарадок—Орша) і ў паўднёвай-заходняй частцы (Слуцк, Жыткавічы, Калінкавічы).

На працягу дэкады значныя ападкі выпалі толькі 2-га, у астатнія дні, калі і выпадалі, то пераважна дробныя ападкі.

Па ўсей БССР назіраліся туманы асабліва ў апошнія дні дэкады.

Вятры пераважалі паўднёва-усходнія, даволі значнай сілы.

Воблачнасць складала 80—100% агульнага пакрыцця неба, пераважалі нізкія дажджавыя формы воблакаў.

Н. Малішэўская.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за верасень м-ц 1934 г.

З боку тэмпературы верасень вызначаецца, як павышана цёплы. Яго сярэдняя тэмпература ў паасобных пунктах перавышае нармальную на 2—3°. Асабліва высокая т-ра назіралася ў пачатку месяца. Сярэднія сутачныя т-ры на поўначы БССР дасягалі 18°, а на поўдні 23°. Пасля гэтага на працягу ўсяго месяца т-ра амаль зусім раўнамерна зніжа-

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра						Адносная вільг. у %		Тэмпература на паверхні глебы			А п	
			Сярэдняя	Адхіленне ад нормы	Максімал.	Дата	Мінімальная	Дата	Сярэдняя	Мінімальная	Мінімальная	Дата	Лік дзён з тэмпературою глебы ≤0°	Сума	Норма
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса . . .	13.7	—	25.8	8	2.2	18	80	30	1.0	20	0	15	—
	3	Полацк . .	14.0	+3.1	24.9	8	3.0	18	80	25	—	—	—	39	44
	—	Вялікія Лукі .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	36	—
	84	Сураж . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	13.6	+3.3	23.8	7	1.5	16	75	35	—1.1	16	2	27	60
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель . .	13.9	—	24.3	2	5.9	21	75	25	5.7	25	0	30	49
	75	Плешчаніцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	37	—
	70	Бобр . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў . .	14.4	+3.1	25.0	1	3.8	25	75	30	4.3	12	0	18	56
	16	Менск . . .	14.2	+2.7	25.8	1	3.7	25	75	25	5.6	25	0	32	53
	93	Бярэзіна . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	27	—
	23	Мар'іна-Горка	14.2	+2.7	26.6	1	2.9	15	75	25	1.5	17	0	18	56
	25	Асіпавічы . .	14.7	+2.7	27.6	1	4.6	21	75	25	5.3	20,21	0	27	—
	10	Орша . . .	13.7	+2.7	25.3	1	2.9	16	75	35	4.5	81	0	28	71
	19	Горкі . . .	13.4	+2.4	24.4	1	2.7	16	75	35	2.3	81	0	18	54
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	22	—
	28	Слуцк . . .	14.3	—	26.8	1	2.7	30	75	25	4.7	24	0	14	—
	30	Мар.-Сосны .	13.8	+1.4	27.2	1	—0.7	21	80	25	—	—	—	16	—
	21	Магілеў . .	14.2	+2.6	25.5	1	3.1	16	75	30	—	—	—	16	54
	73	Чавусы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	27	—
	27	Чэрыкаў . .	14.2	+2.5	26.0	1	2.1	16	70	30	—	—	—	17	47
	191	Касцюковічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	29	—
	31	Турск . . .	14.4	+2.4	27.3	1	3.9	16	70	30	—0.7	21	1	34	—
	32	Жлобін . .	14.9	+2.9	27.7	1	6.0	16,21	70	25	—	—	—	41	—
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы .	14.5	+1.8	27.8	1	4.0	12	75	20	—	—	—	20	—
	37	Калінкавічы .	14.9	+2.4	27.9	1	3.3	24	75	25	—	—	—	4	53
	39	Лельчыцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чэчэрск . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	33	—
	45	Барба . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	14	—
	38	Гомель . .	14.9	+2.7	28.0	1	5.4	21	70	25	4.2	22	0	20	—
	35	Васілевічы .	14.5	+2.2	28.4	1	2.0	12	70	25	0.8	24	0	5	59
	40	Людвінава .	15.1	+2.2	28.1	1	2.0	12	70	20	0.2	29	0	6	—

назіранняў за верасень месяц 1934 г.

а д к і ў м/м							Вецер		Воблачн. у 10-балавай сістэме		Інсаляцыя ў %% магчымай	Лік дзён					
Лік дзён з ападкамі																	
≥ 0.1 мм	≥ 0.5 мм	≥ 1.0 мм	≥ 2.0 мм	≥ 5.0 мм	≥ 10.0 мм	≥ 20.0 мм	Пераважаючы напрамак	Сярэдняя хуткасць	Агульная	Ніжняя		Ясных	Пахмурных	З туманам	З навальн.	З градам	
8	8	6	4	0	0	0	E	3.6	3.0	4.3	—	6	6	2	0	0	—
9	9	8	6	2	1	0	E	3.5	5.3	4.1	—	5	8	4	0	0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
9	8	8	6	1	1	0	—	—	—	—	—	—	—	1	0	0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
11	10	9	7	1	0	0	E	3.3	4.8	3.7	48	4	3	2	0	0	—
10	9	8	5	2	1	0	E	3.5	5.6	3.6	—	5	9	4	0	0	—
13	10	8	5	2	1	0	—	—	—	—	—	—	—	5	0	0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
9	6	6	3	1	0	0	SE	3.1	5.5	3.3	—	8	8	7	0	0	—
11	8	7	4	2	1	0	E	2.8	5.5	—	—	4	8	5	1	0	—
4	4	4	4	2	1	0	—	—	—	—	—	—	—	0	0	0	—
11	5	3	3	1	0	0	E	3.4	6.4	3.1	—	2	11	4	0	0	—
10	6	4	3	2	0	0	E	2.6	5.1	2.2	—	7	7	5	0	0	—
9	8	4	3	2	1	0	E	2.4	4.7	3.0	—	7	7	4	0	0	—
10	7	5	3	0	0	0	E,SE	3.6	4.9	2.1	—	6	7	4	1	0	—
8	7	5	2	1	1	0	—	—	—	—	—	—	—	1	0	0	—
9	6	4	1	0	0	0	E	3.7	5.8	3.3	—	2	7	11	1	0	—
5	4	4	3	1	0	0	W	2.8	4.4	—	—	6	—	5	0	0	—
9	6	4	2	1	0	0	E	2.7	5.2	3.9	—	7	8	6	0	0	—
10	5	5	4	2	1	0	—	—	—	—	—	—	—	0	0	0	—
10	8	6	3	1	0	0	E, S	3.7	4.6	3.6	—	5	3	7	1	0	—
7	7	6	5	3	0	0	—	—	—	—	—	—	—	0	0	0	—
11	7	7	5	2	1	0	SE	4.2	5.0	4.0	—	5	6	3	1	0	—
7	5	4	4	3	2	0	SE	3.8	5.2	2.5	—	5	7	5	2	0	—
9	5	4	4	1	0	0	E	3.0	5.9	3.6	—	2	6	8	1	0	—
5	2	1	1	0	0	0	E	3.1	4.3	2.6	—	7	2	4	1	0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
7	4	3	2	2	1	1	—	—	—	—	—	—	—	3	0	0	—
8	8	4	2	0	0	0	—	—	—	—	—	—	—	8	0	0	—
8	5	5	5	1	0	0	E	3.1	4.9	2.4	—	8	6	3	1	0	—
6	4	2	1	0	0	0	E	3.0	5.3	4.1	50	4	5	6	2	0	—
4	2	1	1	0	0	0	SE	3.5	4.7	3.2	—	6	5	2	1	0	—

лася. Толькі ў канцы 2-ой і пачатку 3-й дэкады адзначана месцамі некаторае часовае павышэнне т-ры. К канцу месяца сярэдняя сутачная т-ра дасягала 5—9°.

Максімальная т-ра дасягала ў паўночнай частцы БССР— +25°, а ў паўднёвай +28°, мінімальная—вагалася ад —0,7° да +6°. Адмоўная т-ра —0,7°, назіралася толькі ў Мар'іна-Соснах (Любаньскага раёна).

Ападкаў выпала невялікая, а мейсцамі і зусім малая колькасць. Асабліва мала ападкаў назіралася на паўднёвым захадзе БССР, ад 14 да 20 мм., а яшчэ менш выпала на поўдні БССР: Калінкавічы, Васілевічы (Рэчыцкага р.) Людвінава (Камарынскага р-на) далі ападкаў на 4—6 мм.

Уздоўж усходняй мяжы таксама выпала мала ападкаў да 20 мм. Больш значная колькасць апалкаў выпала ў большасці паўночнай і цэнтральнай частках БССР, дзе яны раўняліся ад 20 да 40 мм.

На працягу месяца ападкі размеркаваліся наступным чынам: першыя 2 дэкады былі пераважна сухія, месцамі на працягу гэтых дэкад зусім не выпадалі ападкі. Усё-ж адзначаная колькасць ападкаў прыпадае амаль выключна на апошнюю дэкаду 22-ое—25-ае верасня.

Вятры пераважалі ўсходнія і паўднёва-усходнія. Воблачнасць была невялікай, у большасці ад 40 да 50% агульнага пакрыцця неба. Ясных дзён была даволі вялікая колькасць месцамі да 8. У 2-ой палове месяца часта назіраліся туманы.

Н. Малішэўская.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ГІДРА-МЕТ. ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 1—10 лістапада 1934 г.

На працягу першай дэкады лістапада праводзіліся наступныя работы: уборка капусты, укладка ў хавальнікі бульбы, караньплодаў, зяблівае ворыва, апрацоўка ільну і малацьба зернавых. Умовы надвор'я справаздачнай дэкады для правядзення гэтых работ былі спрыяючымі.

Вегетацыя азімых культур, якія знаходзяцца ў фазе кушчэння на працягу гэтай дэкады праходзіла ў вельмі запавольных тэмпах, а ў усходняй частцы рэспублікі к канцу дэкады яна зусім спынілася.

Ацэнка азімых культур здавальняючая.

Патрэбна адзначыць, што наглядаюцца пашкоджанні азімага жыта грыбнымі хваробамі, як іржаўчына і плесень. Апошняя адзначана метст—Чэрыкаў.

В. Стэфановіч.

ЗАГАД № 252

па галоўнаму кіраўніцтву АГМС БССР

ад 13/XI-34 г

§ 1.

Лічыць устаноўленым, што зарплата назіральніку дажджамернага паста вёскі Ратміровічы калгаса „Верны шлях" Аземлянскага с/сов. Глускага р-на т. Саковічу Антону Лаўрэневу не выплачывалася на працягу дзесяці (10) месяцаў (з 3 сакавіка па 1 студзеня 1933 г.). Гэта здарылася дзякуючы таму, што Заг. Аддзелу Метэаралогіі тав. Кузьмін, які ведаў і абяцаў асабіста забяспечыць высылку зарплаты т. Саковічу, але не забяспечыў праверку выканання і не далажыў мне аб гэтым ненармальным з'явішчы і бюракратычных адносінах да запатрабаванняў работнікаў перыфэрыі.

Пры чым т. Кузьмін фармальна аднёсся да заявы т. Саковіча „што ён у апошніх чыслах снежня 1933 г. асабіста прыязжаў у Менск і яму абяцалі выслаць зарплату і не выслалі, што вымусіла яго прыехаць у другі раз". У выніку чаго засталіся без пакарання вінаватыя ў гэтым асобы.

За такія адносіны да работнікаў перыфэрыі Начальніку Аддзела Метэаралогіі тав. Кузьміну вынашу суровую вымову і папярэджваю, што калі ў далейшым з боку Аддзела Метэаралогіі будуць наглядацца выпадкі несвоечасовага адказа на запросы работнікаў перыфэрыі будзе пастаўлена пытанне аб прыцягненні к судовай адказнасці.

§ 2.

Бухгальтару т. БОЯРОВІЧУ прапаную тэрмінова перавесці заробак тав. САКОВІЧУ, а таксама перавесці кошт праезду да Менска сорок восем руб. (48 р.) за кошт тав. КУЗЬМІНА.

§ 3.

Копію загада накіраваць Прокурору С/Гасп. сектара тав. ПАЛЕЮ і надрукаваць у бюлетэні.

Нач. ГК АГМС
БССР (МАМАЕЎ)

ПРАЎЛЕННЮ КАЛГАСА „ЧЫРВОНЫЯ ЛУКІ"

Рэчыцкі раён, Какуевіцкі с/с
калгас „Чырвоныя Лукі".

У адказ на Вашу адносіну ў якой Вы просіце растлумачыць змест Бюлетэня Надвор'я паведамляем:

Дэкадны бюлетэнь, які Вы атрымліваеце, мае сваей мэтай паведамленне організацый аб становішчы надвор'я за мінулую дэкаду (дзесяць дзён), а таксама за м-ц па асноўным элементам надвор'я як-то: тэмпературы, ападках, воблачнасці, па напрамку і сіле ветра і іншым. Усе гэтыя

элементы сводзяцца ў табліцу і да яе дадаецца кароткі пісьмовы тэкст. Табліца даецца ў наступным відзе.

1. Графа „тэмпература" разбіваецца на рад падграф. У першых дзесяці падграфах супроць кожнага пункту паказана, якая с я р э д н я я тэмпература паветра трымалася на працягу кожнага дня гэтай дэкады.

Падграфа „сярэдняя" паказвае сярэднюю тэмпературу за ўсю дэкаду.

Падграфа „нармальная"—дае сярэднюю шматгадовую тэмпературу за даную дэкаду.

Параўнанне падграф „сярэдняя" і „нармальная" дае магчымасць судзіць ці з'яўляецца дадзеная дэкада больш цёплай, або больш халоднай чымся гэта бывае „нармальна". (Сярэдняя за шмат гадоў).

Падграфа „максімальная" гавора, якая была самая высокая тэмпература на працягу дэкады (звычайна яна бывае пасля поўдня).

Падграфа „мінімальная" дае самую нізкую тэмпературу, якая назіралася на працягу дэкады (звычайна самая нізкая тэмпература бывая ноччу, або раніцай перад усходам сонца).

Падграфа „число, калі наглядаўся мінімум"—тут стаяць лічбы, якія паказваюць калі іменна (дата) наглядалася самая нізкая тэмпература.

II. Графа „адносная вільготнасць паветра за 13 г. у %%—паказвае на колькі працантаў было насычана паветра вільгаццю ў сярэднім за ўсю дэкаду ў 13 гадзін (13 гадзін бярэцца таму, што звычайна каля гэтага часу паветра бывае найбольш сухім).

III. Графа „тэмпература паверхні глебы" таксама разбіваецца на рад падграф.

Падграфа „максімальная" паказвае, якая найбольшая тэмпература назіралася па паверхні глебы на працягу дэкады.

Падграфа „мінімальная" дае самую нізкую тэмпературу, якая была на паверхні глебы на працягу дэкады.

Падграфа „число, калі назіраўся мінімум"—тлумачэнняў не патрабуе.

IV. Графа „Ападкі ў мм."—тут, як і для графы „тэмпература", даецца для кожнага дня колькасць выпаўшых ападкаў у міліметрах. (У сантыметры—10 міліметраў). Калі ў дадзены дзень дэкады ападкаў не было, так тады на адпаведным месцы ставяцца дзве кропкі.

Як патрэбна разумець надрукаваныя ў адпаведных падграфах лічбы? Напрыклад, у Бюлетэні № 26 за другую дэкаду верасня 1934 г. можам заўважыць, што ў Чэрыкаве 15 верасня выпала 2 міліметра ападкаў.

Што значыць „выпала два міліметра ападкаў"? А гэта значыць, што калі-б вада ад выпаўшага дажджа не выпаралася, не прасочвалася ў глебу, не сцякала ў больш нізкія месцы, так паверхня глебы пасля дажджа была-б пакрыта вакол Чэрыкава пластом (слоем) вады таўшчынёй у 2 ململі-

метры; на адзін гектар гэты пласт вады дасць 20.000 літраў, або дваццаць тон вады.

Падграфа „сума“ дае нам колькі міліметраў выпала за дэкаду.

Узімку, калі выпадае снег, колькасць выпаўшых ападкаў даецца таксама ў міліметрах таго пласта які-б атрымаўся, калі-б выпаўшы за дзень снег увесь расстаяў.

На наступнай старонке нашага бюлетэня ёсць графа „Вецер“. У адпаведных падграфах даюцца: пераважаючы за дэкаду напрамак ветра і сярэднія за дэкаду хуткасць ветру.

Напрамак ветру адзначаецца той старонкай гарызонта адкуль ён дзме:

E—адзначае, што за дэкаду вецер дуў пераважна з поўначы.

S—адзначае, што за дэкаду вецер дуў пераважна з усходу.

W— з поўдня.
NE—з захаду.
SE—з паўднёвага ўсходу.
SW—з паўднёвага захаду.
NW—з паўночнага захаду.

Хуткасць ветра даецца ў метрах у секунду (сярэдняя за дэкаду). Напрыклад, у Чэрыкаве за другую дэкаду верасня (гл. бюлетэнь № 26). Сярэдняя за дэкаду хуткасць была 2 метра ў секунду (значыць паветра рухалася з хуткасцю звыш 7 кілометраў у гадзіну).

У графе „максімум хуткасці ветра“ паказана, якая была найбольшая хуткасць ветра на працягу дэкады і адкуль гэты вецер дуў. Для цікавасці можна прывесці наступную лічбу: калі вецер мае хуткасць 20 метраў у секунду, так ён цісне на адзін квадратны метр сцяны дома з сілай у 50 кілаграм, калі гэта сцяна проста падстаўлена ветру.

Графа „інсаляцыя ў %%“ адлюстроўвае нам працягласць сонечнага ззяння ў процантах ад магчымага, калі-б зусім не было-б воблакаў. Напрыклад, Васілевічы (гл. № 26 ДБ) даюць для II дэкады верасня 68%, а Нова-Каралёва 62%. Што адзначаюць гэтыя лічбы. А адзначаюць яны вось што. Калі-б не было воблакоў на працягу дэкады, так і ў Новым-Каралёве і ў Васілевічах сонца свяціла-б увесь час і мы мелі-б 100% сонечнай „інсаляцыі“. Але гэтага ніколі не бывае; мы бачым, што ў Новым-Каралёве за другую дэкаду верасня сонечнае ззянне было меншае чымся ў Васілевічах.

Графа „сярэдняя воблачнасць у 10 балавай сістэме“. Што такое 10 балавая сістэма? Калі ўсё неба пакрыта воблакамі—мы ацэньваем воблачнасць лічбай 10, калі палова неба пакрыта воблакамі, воблачнасць ацэньваецца лічбай 5 і г. д.

„Агульная воблачнасць“ паказвае наколькі неба пакрыта воблакамі ўсіх відаў; „ніжняя воблачнасць“ паказвае на-

1964 г.

колькі пакрыта неба толькі нізкімі воблакамі. У Бюлетэні прыводзяцца лічбы сярэднія за дэкаду.

Падобныя лічбовыя табліцы па ўсіх метэаралагічных элементах (температура, ападкі, вецер і г. д.) змяшчаюцца і за месяц.

У бюлетэні даецца інфармацыя аб мінулым надвор'і, сельска-гаспадарчая характарыстыка.

Прагнозы надвор'я на суткі ўперад перадаюцца з Менска штодзённа па радыё ў наступныя гадзіны: 16 г. 05 мін. і ў 22 г. 55 мін. У гэтыя-ж гадзіны перадаюцца і прагнозы надвор'я на больш доўгія перыяды.

Нач. аддз. метэаралогіі (Кузьмін).

Ст. спэцыяліст (Кучынскі)

1245

(Працяг будзе).

Адказны рэдактар П. Мамаеў

Друкарня БелАН. Зак. № 366. Гарліт № 8103. Тыраж

B0000002378108